Мінск прыме чэмпіянат Еўропы па фехтаванні ў 2020 годзе

Мінск прыме чэмпіянат Еўропы па фехтаванні ў 2020 годзе, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік старшыні Беларускай федэрацыі гэтага віду спорту Андрэй Губанаў.

Рашэнне аб правядзенні турніру прынята на кангрэсе Еўрапейскай канфедэрацыі фехтавання (EFC) у сербскім Нові-Садзе. Як адзначыў Андрэй Губанаў, для правядзення буйнога міжнароднага турніру плануецца задзейнічаць мінскі Палац спорту. "Гэты комплекс добра вядомы многім камандам пасля чэмпіянату Еўропы для атлетаў да 23 гадоў. Дарослы кантынентальны форум крыху больш па маштабах і па колькасці ўдзельнікаў, таму акрамя Палаца спорту хацелася б задзейнічаць і плошчы прылеглай лядовай пляцоўкі спартшколы БФСТ "Дынама". На кангрэсе ў Сербіі прадстаўнікі іншых краін добрымі словамі адклікаліся аб маладзёжным чэмпіянаце Еўропы, які ў красавіку 2017 года адбыўся ў Мінску, і аднагалосна прагаласавалі за Беларусь, якая атрымала права правядзення больш буйных спаборніцтваў у 2020 годзе", - распавёў намеснік старшыні федэрацыі. У Нові-Садзе таксама прынята рашэнне, што чэмпіянат Еўропы 2019 года пройдзе ў нямецкім Дзюсельдорфе. У мінскім еўрапейскім форуме фехтавальшчыкаў ў 2020 годзе плануецца ўдзел больш за 500 спартсменаў.

Крыніца: belta.by

У склад Выканкама і Прэзідыума Грамадскага аб'яднання «Беларуская рэспубліканская федэрацыя фехтавання» уваходзіць намеснік Міністра сувязі і інфарматызацыі Гардзеенка Наталля Міхайлаўна.

Сайт ГА «Беларуская рэспубліканская федэрацыя фехтавання» http://www.fencing.by

---

Source URL: *https://mpt.gov.by/news/25-06-2018-3266*